раз по-новому освещающих отдельные звуки, интонации, гармонические комплексы, тонкая вязь пассажей, растворяющих тему-образ; сонорные эффекты, окутывающие бесстрастные «белые ноты» прихотливыми «всплесками», таинственными «возгласами», озаряющими их бликами, проблесками аккордов-соноров, создают ощущение зачарованности, погружения в таинственные глубины и вызывают ассоциации с живописной манерой художников-импрессионистов [1, с. 26]. Изобразительностью отмечено и произведение швейцарско-французского композитора А. Онеггера «Пасифик-231» («Pacific-231»). В данном сочинении с помощью оркестровых средств автор достаточно точно изображает звуки паровоза, который медленно отправляется со станции и постепенно набирает скорость.

Музыка как вид искусства обладает достаточно сложной структурой специфических и неспецифических выразительных средств, которые исторически возникали и развивались в определенных системах музыкального мышления. Физический материал музыкального искусства (звук) становится изобразительно-выразительным средством, благодаря которому данный вид презентирует, транслирует себя в художественном пространстве произведения, а также расширяет область чувств и смыслов, образуя единство изобразительно-выразительных начал для отражения действительности.


1. Александрова, Н. В. Ассоциативность художественного мышления : учеб. пособие / Н.В. Александрова. – Минск : РИВШ БГУ, 2004. – 202 с.

2. Асафьев, Б. В. Критические статьи и рецензии / Б. В. Асафьев. – М.-Л. : Музыка, 1967. – 300 с.

3. Днепров, В. Д. Проблемы реализма / В. Д. Днепров. – Л. : Сов. писатель, 1960. – 351 с.

4. Зись, А. Я. Виды искусства / А. Я. Зись. – М. : Знание, 1979. – 128 с.

5. Кремлев, Ю. А. Очерки по вопросам музыкальной эстетики / Ю.А. Кремлев. – М. : Музгиз, 1957. – 242 с.

6. Музыка XX века: Очерки: В 2 ч. – М. : Музыка, 1976. – Ч.1, Кн.1 – 367 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ КЕРАМІКА. ПЛЕНЭРЫ «АРТ-ЖЫЖАЛЬ»


**Васюк Т. І.**

*дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (г. Мінск)*



***Аннотация.*** *В статье автор освещает процесс развития нового направления в декоративно-прикладном искусстве Беларуси XXI столетия. В ней излагаются вопросы по определению синтеза авторской формы и древней обработки глины, подводятся итоги проведения 17 международных пленэров «Арт-Жыжаль», результатом которых явились реконструкция и дальнейшее совершенствование древних технологий «обвары» и «раку».*

***Summary.*** *In the article the author covers the development of a new direction in the decorative and applied art of Belarus of the 21st century. It sets out the questions on determining the synthesis of the author's form and the ancient processing of clay, sums up the results of 17 international plein airs «Art-Zhyzhal», which resulted in the reconstruction and further improvement of the ancient technologies «decoction» and «cancer».*


Міжнародныя пленэры «Арт-Жыжаль» маюць вялікае значэнне для развіцця

нацыянальнай школы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. У час іх правядзення адбылася рэканструкцыя старажытных тэхналогій апрацоўкі гліны метадам «раку» і «абвары» пры выкарыстанні земляных горнаў і абпалу дравамі. Вопыт прафесійных мастакоў-керамістаў быў даступны ўдзельнікам пленэру. Абмен сакральнымі ведамі мастакоў-керамістаў адбываўся ў час працы ў палявых умовах. Вырабляліся сумесныя творчыя працы, адбываліся абмеркаванні твораў, прагляд персаналій мастакоў і правядзенне многіх творчых выстаў, якіх за сямнаццаць пленэрных гадоў адбылося звыш сотні на розных узроўнях і ў разнастайных фарматах: палявыя, раённыя, абласныя, рэспубліканскія і міжнародныя.

Гістарычна адбыўся невялікі перапынак у вырабе абварной керамікі, але этнапамяць захавала экалагічную і прыгожую тэхналогію апрацоўкі гліны. Напрыканцы ХХ стагоддзя зноў адрадзілася «абвара», але ўжо ў новай якасці, як артдэко, а не ўжытковая функцыянальная кераміка.

У сучасным дэкаратыўна-прыкладным мастацтве адбываецца імкненне да сінтэзу традыцыі і сучаснасці. Таму канструкцыя вырабаў выконвалася майстрамі пры дапамозе сучасных пластычных сродкаў і формаў, а дэкаратыўная і тэхналагічная апрацоўка гліны робіцца старажытнымі метадамі «задымлення» і «абвары».

Неабходна зазначыць, што сучасныя мастакі не маюць магчымасці ў рамках мегаполісу выраблять унікальную кераміку абпалам у горне з выкарыстаннем дроў. Электрычная энэргія абмяжоўвае магчымасці мастака, яна робіць аўтарскія асобнікі больш падобнымі адзін да аднаго. Сінтэз, як дуэт старажытнай архаічнай тэхналогіі і сучаснай формы вырабаў нараджае сам творчы працэс, які амаль немагчыма апісаць словамі, яго трэба адчуць. Тайна творчасці на пленэрах «Арт-Жыжаль» увасабляецца ў вельмі нечаканых дэкаратыўных эфектах, якія кладуцца на сучасную форму вырабаў з гліны.

Ёсць у абварной кераміцы яшчэ адна істотная назва – «гартаваная кераміка». Гартуецца яна за кошт перапыненага абпалу. З гарачай печы з высокім агнем дастаюць абцугамі вырабы і акунаюць у падагрэтую мучную кіслую рошчыну – баўтушку з дамешкамі расолаў і кіслай арганікі. Гэта асноўная адметнасць з мноствам сакрэтаў і тонкасцяў у самім працэссе перапыненага агню. Кіслы раствор для абвары робіцца за некалькі дзён загадзя з жытняй ці пшанічнай мукі з дабаўленнем капуснага, агурэчнага ці бурачнага расолу.

Старажытная, аднаўленая тэхналогія гартаванай ці абварной керамікі адрадзілася ў канцы ХХ ст. і ў пачатку ХХІ ст. набыла шырокую папулярнасць у час правядзення пленэраў «Арт-Жыжаль», што кожны год праходзяць недалёка ад Бабруйска, у лесе, на беразе Бярэзіны.

Традыцыя ладзіць пленэры на Беларусі ўзнікла ў 1992 годзе, яе распачаў Уладзімір Вікенцьевіч Угрыновіч, загадчык кафедры керамікі Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (зараз БДАМ). Паплечнікамі Угрыновіча былі выпускнікі і студэнты кафедры керамікі, у тым ліку Калтыгін Валерый Аркадзьевіч, нязменны кіраўнік 17 міжнародных пленэраў па кераміцы «Арт-Жыжаль», пачынаючы з 2002 года. Ідэя правядзення творчых «фэстаў» у форме пленэраў сфарміравала канцэпыю дадзенага мерапрыемства. Смелая рашучасць майстра керамікі, адданага творчасці мастака Калтыгіна Валерыя мела вялікае мноства перашкод на шляху ажыццяўлення ідэі. Клопат арганізатара быў накіраваны на вывучэнне тэмы пленэраў. Ён выкарыстаў гістарычны, навуковы, тэхналагічны, творча-эксперыментальны напрамак у творчасці мастакоў-керамістаў. Эканамічныя, гаспадарчыя і арганізацыйныя клопаты патрабуюць шмат ўвагі мастака.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГТУКІ

Толькі пасля таго, як улады Бабруйска і Магілева далі згоду на фінансаванне першага пленэра ў 2002 годзе прыйшла палегка да руплівага майстра В.А. Калтыгіна. Месца правядзення пленэра – прыгожы бераг Бярэзіны недалёка ад Бабруйска. Гэта летнія домікі ў Вербках.

Завезены дровы, гліна, адбыўся заезд мастакоў. Пачынаецца працэс творчасці і выраб двух земляных горнаў. У гэтым працэсе ўдзельнічаў яшчэ адзін сааўтар пленэру – Бог агню па славянскай міфалогіі. Гэта – Жыжаль, Жыжа, Жужа. Без яго гліна не можа пераўтварыцца ў кераміку, пакуль яна не абпалена. Выява Жыжаля зроблена на харугве пленэра, якая вывешана каля печаў. Ён пільнуе кожны абпал, назірае, цешыцца, а напрыканцы пленэру Бог атрымлівае ахвяраванні ў выглядзе вырабаў з гліны.

Узнікла неабходнасць разгледзець канцэпцыю, пабудову, форму арганізацыі творчай дзейнасці мастакоў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі ў час міжнародных пленэраў «Арт-Жыжаль». Міжнародны пленэр «Арт-Жыжаль» – значная падзея ў культурным жыцці краіны і замежжа. У Бабруйску ў галерэі Г. Паплаўскага ўжо сабрана звыш сямісот творчых эксперыментальных прац мастакоў-керамістаў удзельнікаў пленэру з усяго свету: Расіі, Малдовы, Украіны, Літвы, Польшчы, Балгарыі, Сербіі, Ізраіля, Венесуэлы, Азербайджана, Францыі, Скандынаўскіх і іншых краін. Гэта калекцыя керамікі можа скласці экспазіцыю музея дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва альбо музея керамікі.

Неабходна зазначыць, што вучоныя Акадэміі навук Беларусі сцвярджаюць, што гэта тэхналогія апрацоўкі гліны з’явілася ў далёкія часы неаліту. Было заўважана, што кіслая вадзяная баўтушка з зярнятак злакавых раслін закрывае поры ў гліняным гаршку і робіць яго воданепранікненным, пры тым рабым, як яйкі перапелак, прыгожым і дэкаратыўным. Цікава, што рабая альбо абварная тэхналогія апрацоўкі гліны дайшла да нашага часу. На тэрыторыі Беларусі ў 1992 годзе не стала апошняга майстра па «абвары» Вярэйка з вёскі Геневічы Клецкага раена. У Сіняўцы таксама выраблялі абварную кераміку да 1970-х гадоў.

Аднакамерныя печы размяшчаліся на паветры, на вуліцы, а не ў памяшканні. Часцей за ўсё яны выраблялiся з цэглы, гліны і гаршкоў, зверху і па баках яны засыпаліся зямлёй. Вусце рабілася арачнай формы, а чарэнь выраблялі глінабітным ці з каменняў. Археолагі сцвярджаюць, што разнастайнасць пабудовы печаў уражвае навукоўцаў сваёй канструктыўнай вынаходлівасцю. У палымяных печах абпальвалі гліну на працягу тысячагоддзяў. Удзельнікі пленэраў «Арт-Жыжаль» заўважылі, што палымяны абпал гліны дае большую спякаемасць чарапку, дае шырокую танальную эфектнасць паверхні вырабаў у параўнанні з электрычнымі ці газавымі абпаламі.

У Падняпроў’і і Цэнтральным рэгіёне Беларусі ўжываліся круглыя і чатырохвугольныя горны. У зямлі капалася яма, якую выкладалі абпаленай цэглай, камянямі ці сырцом з цэглы, затым будавалі істопку, часцей за ўсе арачнай формы. Над істопкай будавалі будку-дах. Знешне такая печ-горн нагадвае добра ўмацаваны бункер, абкладзены валунамі і дзярноўкай і засыпаны зямлёй. На поўдні Беларусі печы абносіліся зрубамі і прыкрываліся лістом жэсці.

Эвалюцыя горнаў складае асаблівую тэму даследавання, якой прысвечана значная дзеючая частка працы міжнароднага пленэра па кераміцы «Арт-Жыжаль».

Трэба адзначыць, што ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў вядуцца эксперыментальныя абпалы па «абвары» і «задымленні» у рамках вучэбнага працэсу і эксперыментальнай творчасці. У 1997 годзе дыпломная праца Кірычак Наталлі была зроблена з выкарыстаннем тэхналогій перапыненага агню ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэхніцы «гартавання» ці «абвары». Зараз больш дзесяці выпускнікоў кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва паспяхова працуюць у тэхніцы абвары, ствараючы новыя эфекты пры дапамозе сыра, водкі, бярозавіку і іншых арганічных дамешак. Вось шэрах вядомых імёнаў маладых мастакоў-керамістаў, выпускнікоў вытворчай майстэрні Васюк Тамары Іванаўны: Цітаў Кастусь, Гром Дзяніс, Краско Кастусь, Касьяненка Дзмітрый, Павельчук Данііл, Дашкоў Іван і іншыя з тых, хто аднаўляе «абвару» ў сучаснай форме творчасці.

На пленэрах «Арт-Жыжаль» адбываецца аднаўленне спосабаў ручной лепкі ў палявых умовах. Вопыт прафесійных мастакоў перадаецца маладым у форме майстар-класаў, пры тым асаблівая ўвага надаецца рукатворнасці формы ў яе трохмерным значэнні, у аб’ёме.

Абавязковай умовай пленэраў з’яўляецца эксклюзіўнасць і эксперыментальнасць работы керамістаў, незвычайнасць і эксперыментальнасць творчых праектаў, якія індывідыялізуюцца кожным удзельнікам у рамках пленэраў «Арт-Жыжаль».

Кожны год пленэр мае непаўторны асабісты дэвіз і ставіць новую задачу для вырашэння: «Мастацтва і асяроддзе пражывання», «Вогненная скульптура», «Вопыт майстэрства», «Скульптура ў прасторы інтэр’ера».

Іннавацыйным дасягненнем пленэраў «Арт-Жыжаль» безумоўна з’яўляецца рэканструкцыя абварной керамікі, яе міжнароднае распаўсюджванне і прызнанне. Гэта новы мастацкі напрамак у дэкаратыўна-прыкладной творчасці. Беларускія мастакі заўсёды на пленэрах вылучаюцца асаблівай добразычлівасцю і працавітасцю. Працэс адбываецца няспынна і днем, і ноччу. Нарыхтоўка дроў, гліны, абпал печаў, загрузка, разгрузка, закопванне ям па задымленні і рэдукцыі вырабаў, нарыхтоўка хвоі – усё гэта робіцца гуртам, талакой.

Здаецца, што Валерый Аркадзевіч ведае ўсе мовы свету: ён размаўляе з французам, венесуэльцам, латышом на мове мастацтва, а яна зразумела ўсім народам – гэта мова хараства. Так хараство нараджаецца ў старажытнай земляной печы прамога ці зваротнага агню.

На тэрыторыі Беларусі «задымленне», як і «абвара» існавалі з даўніх часоў. Пры гэтым ужывалі два тыпы печаў – «горнаў» авальнай і чатырохвугольнай формаў, аднакамерныя і двухкамерныя па канструцыі.

Абпал – самая адказная стадыя ганчарнай вытворчасці. Каб кіраваць агнём, трэба быць яго сябрам, тады з гліны народзіцца непаўторная кераміка.

Тэхналогія «раку» узнікла ў Японіі ў старажытныя часы, а ў апошнім стагоддзі яна атрымала другое дыханне, уздым і значэнне стылю. Асноўнымі відамі керамікі раку былі кубкі «цяван» для чайнай цырымоніі зробленыя ўручную без дапамогі ганчарнага кола. Абпал керамікі ў стылі адбываўся адмыслова, без доступу кіслароду з выкарыстаннем аксідаў медзі, жалеза, марганца, якія давалі ў адноўленным асяроддзі вельмі багатую незвычайную палітру колераў. Умела нанесеная паліва, ручная лепка, асаблівы абпал у малой печцы майстар Тодзіра ўжываў сваю тэхналогію перапыненага агню. Вымаў з печы гарачы выраб і клаў яго ў салому. А на пленэры «Арт-Жыжаль» салому замянілі зялёнымі хвойнымі галінкамі і шышкамі, апілкамі. Паміж японскім керамістам Тодзіра і беларускімі керамістамі ўзнікла падабенства ў падыходах да працэсу абпала керамічных вырабаў.

Багатае творчае ўяўленне, жаданне парадніцца з агнем і ўтрыманне творчага агню ў думках мастакоў дае поспех у выніку абпалу. Тэхналагічныя сродкі і дарагія пры гэтым матэрыялы не маюць рашучага значэння.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзякуючы стылю «раку», у кераміцы з'явіўся новы напрамак творчасці, а на пленэрах «Арт-Жыжаль» адбыўся сінтэз двух напрамкаў творчасці традыцыі і сучаснасці – «раку» і «абвары».

Звыш сотні выстаў «Арт-Жыжаля» прынеслі вядомасць і творчы поспех такім мастакам з творчым агнём у душы як Калтыгін Валерый Аркадзевіч (лаурэат Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь), Концуб Анатоль Аляксандравіч (заслужаны дзеяч мастацтваў, лаўрэат міжнародных конкурсаў), Адзіночанка Яўген (лаурэат міжнародных конкурсаў і сімпозіумаў па кераміцы), Васюк Тамара Іванаўна (лаурэат Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь), Шчасная Ірына (лаурэат шматлікіх конкурсаў па кераміцы), Ткачоў Алег (лаурэат рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў па кераміцы, нязменны ўдзельнік усіх 17 пленэраў, памочнік В.А. Калтыгіна ў правядзенні абпалаў «раку» і «абвары», выпускнік кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Неабходна зазначыць, што творчы праект «Арт-Жыжаль» удала падтрымаў тэндэнцыю стварэння ўнікальных твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якая сфарміравалася ў гэтай галіне дзякуючы прафесійным мастакам. Мастацтвазнаўчы аспект праекта «Арт-Жыжаль» амаль не вывучаны. Вызначаны толькі асобныя творы вядучых мастакоў, а не цэласны напрамак дзейнасці і пераасэнсаванне спадчыны і будучыні Беларусі. Праект ажыццявіў сувязь часоў. Супернатуральны дэкаратыўны эфект рабых плямінак «абвары» і складаны танальны пераліў задымленых паверхняў керамічных вырабаў падкрэсліваюць непаўторную ўнікальнасць усёй калекцыі керамікі праекта «Арт-Жыжаль».

1. Сучаснае беларускае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. XXI стагоддзе : альбом / аўтар тэксту, склад., пер. на беларус. мову К. С. Аксёнава. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2013. – 400 с.

2. Васюк, Т. І. Мастацкія і тэхналагічныя асаблівасці абварной, або гартаванай керамікі / Т.І. Васюк // Мастацкая адукацыя і культура. – Мінск. – 2013. – № 2.

## БИОГРАФИЯ КАК МИФ: К ПРОБЛЕМЕ ИНТЕРПРЕТАЦИИ ТВОРЧЕСТВА АРАМА ХАЧАТУРЯНА

**Варданян О. И.**
*концертмейстер, соискатель кафедры истории и теории музыкального исполнительства Национальной музыкальной академии Украины им. П.И. Чайковского (г. Киев)*

***Аннотация****. В статье анализируется феномен мифологизации творчества Арама Хачатуряна в культурном контексте советской эпохи. Рассматриваются способы интерпретации творческой биографии в соответствии с принципами марксистской эстетики, и предлагаются подходы к целостному анализу и демифологизации с помощью современных аналитических методов.*

***Summary****. The article analyzes the phenomenon of mythologizing of Aram Khachaturian's musical heritage in the cultural context of the Soviet era. Considers methods of interpretation of his life and music in accordance with the principles of Marxist aesthetics. Suggests a holistic approach to the analysis and demythologizing using modern analytical methods.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ